Звязда

29.10.2018

# Ці цікавяцца школьнікі літаратурай?

---

Валяр'ян Шкленнік

**У Беларусі праходзіць II Міжнародны сеткавы праект «ЧтениеPRoДвижение». Ён скіраваны на развіццё чытацкай культуры пры дапамозе фарміравання матывацыі і ўстойлівага цікавасці да чытання, пашырэнне кругагляду ў сучасным інфармацыйна-камунікацыйным асяроддзі.**




---

На творчую сустрэчу з беларускімі пісьменнікамі прыехалі чытачы з усіх рэгіёнаў Беларусі. А ў фае Нацыянальнай бібліятэкі разгарнулася выстава конкурсу малюнкаў школьнікаў па творах сучасных беларускіх аўтараў.

Пісьменнікі разважалі, наколькі зараз запатрабавана чытанне ў розных узроставых групах.

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, «Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы» Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», грамадскае аб'яднанне «Саюз беларускіх пісьменнікаў», Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», грамадскі саюз «Міжнародны

педагагічны клуб», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», пры падтрымцы Беларускай Праваслаўнай Царквы.